# Адказы на заданні рубрыкі «Гэта цікава!»

**Заняткі 1.** Пра літару ***о***.

**Заняткі 2.** Пра літару ***ё***.

**Заняткі 3.** З'яўленне першага гука [а] абумоўлена законам акання, г. зн. пераходам ненаціскнога гука [о] ў гук [а]. Спалучэнне ***ія*** замест ***еа*** тлумачыцца тым, што для фанетыкі беларускай мовы нехарактэрнымі з'яўляюцца спалучэнні двух галосных гукаў у межах адной значымай часткі слова. Таму паміж такімі галоснымі ў многіх словах з'яўляецца гук [й], які, згодна з нормамі беларускай арфаэпіі, павінен вымаўляцца выразна.

**Заняткі 4.** Памылкі сапраўды пажаданыя, нават неабходныя, у вусным маўленні — так патрабуе арфаэпія. А ў арфаграфіі — свае патрабаванні. Таму мае рацыю настаўніца: яна дыктуе правільна.

**Заняткі 5.** Афіцыйную назву Рэспублікі Беларусь прынята выкарыстоўваць толькі ў найменнях дзяржаўных устаноў (*«**Беларусь**фільм»*, *«**Беларусь**калій»*), а *«**Беларус**банк»* — гэта акцыянернае таварыства.

**Заняткі 6.** *Чацвер*.

**Заняткі 7.** Літара ***ў***.

**Заняткі 8.** Эдзік выканаў заданне няправільна таму, што *збожжа*, *галлё*, *снеданне* — гэта словы з падоўжанымі зычнымі (фанетычная з'ява), а *аддаены*, *рассыпаць* — з падвоенымі (марфалагічная з'ява).

**Заняткі 9.** Словы славянскага паходжання (за некаторым выключэннем) не могуць пачынацца з літа-

Спампавана з сайта aversev.by

ры ***о*** таму, што ў беларускай мове перад літарай ***о*** ўзнікае прыстаўная літара ***в***.

*Ого́*, *ой*, *о́кацъ*, *о́каючы*, *о́хра*, *о́хрыцъ*, *о́хабенъ* (старадаўняе рускае верхняе адзенне ў выглядзе каф-тана з чатырохвугольным адкладным каўняром).

**Заняткі 10.** Сімвалам *сонца*.

Спампавана з сайта aversev.by